*І. М. Грамовіч*

# ШЛЯХІ ЗАСВАЕННЯ БЕЛАРУСКАГА ПЕСЕННАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў АМАТАРСКІХ І ВУЧЭБНЫХ КАЛЕКТЫВАХ

У артыкуле разгледжаны шляхі засваення песеннага фальклору ў аматарскіх і вучэбных калектывах Рэспублікі Беларусь.

Аўтар праводзіць невялікі экскурс у гісторыю станаўлення аматарскага харавога мастацтва, апісвае значнасць некаторых персон у станаўленні гэтага жанру. Даецца характарыстыка творчасці сучасных аматарскіх калектываў, якія працуюць у вобласці аўтэнтычнага і стылізаванага фальклору, аналізуецца дзейнасць вядомых вучэбных фальклорных гуртоў. Аўтар вызначае праблемы ў захаванні і засваенні народнапесенных традыцый Беларусі на сучасным этапе.

Народнапесенная аматарская творчасць з'яўляецца не толькі пераемніцай фальклору, але і своеасаблівай масавай лабараторыяй па яго крытычным пераасэнсаванні, развіцці і ўзбагачэнні на падставе сацыяльна-грамадскіх змяненняў, якія адбываюцца ў нашай рэспубліцы.

Самым распаўсюджаным жанрам фальклору з'яўляецца вакальна-харавы. У рэспубліцы па даных на 2002 г. налічваецца больш за 8 тыс. калектываў, 482 з якіх носяць званні «народны», «узорны», што гаворыць аб іх даволі высокім прафесійным узроўні [1, с. 91 ].

Сапраўды, масавасць і даступнасць дазваляе харавой аматарскай творчасці быць глебай культурнага жыцця беларускага грамадства, носьбітамі і паказчыкамі яго патэнцыяльных магчымасцей у сучасным сацыякультурным асяроддзі. Народнапесенная творчасць — вельмі важны пласт нацыянальнай культуры, яе аснова, без якой немагчыма фарміраванне нацыянальнай песеннай самасвядомасці.

Гісторыя станаўлення песеннай аматарскай творчасці бярэ пачатак з тых часоў, калі свае нацыянальныя песенныя традыцыі праслаўлялі народныя хары пад кіраўніцтвам Т. Лапацінай, Ф. Пятрэнкі, Г. Цітовіча. Многія важныя асаблівасці народных спеваў вызначаліся менавіта дзякуючы творчасці названых асоб. Беражлівыя адносіны да фальклору, да беларускай народнай песні, як мага больш набліжаліся ў іх творчасці да традыцыйных узораў народнапесеннай спадчыны.

Дасягаць праўдзівага, у адпаведнасці з традыцыямі, выканання песні кіраўнікі хароў імкнуліся праз глыбокае вывучэнне музычнага матэрыялу. Таму кіраўнік хору в. Прыбыткі Гомельскай вобласці Ф. Пятрэнка сам падбіраў рэпертуар, глыбока вывучаў тэкст песні, час, калі ўзнік твор, расказваў аб гэтым удзельнікам хору і такім чынам вучыў узнаўляць мясцовыя традыцыі выканання песні.

Рэпертуар хору в. Азершчына Гомельскай вобласці, фарміраваўся на глебе зліцця традыцыі дзявочай сялянскай і масавай песні прафесійных кампазітараў. Выключна разнастайна была прадстаўлена беларуская народная песня ў шматлікіх пастаноўках вясковага хору.

Вельмі значнай у напрамку засваення і развіцця народнапесеннага мастацтва была творчасць хора в. Вялікае Падлессе Брэсцкай вобласці пад кіраўніцтвам Г. Цітовіча. Выступаючы на шматлікіх злётах самадзейных кампазітараў, ён настойліва падкрэсліваў неабходнасць усебаковага даследавання народ-



напесенных традыцый [2, с. 254 ]. Музыкант-этнограф сабраў шмат народных песень, якія адлюстроўвалі жыццё беларускіх вёсак. Асабліва значны ўклад хора ў стварэнні шматгалосных песень і распеву на некалькі галасоў.

У пасляваенныя гады аматарская творчасць дасягнула вялікага размаху. Амаль што на кожным прадпрыемстве ствараліся народныя хары. Цяжка было прабівацца праз жорсткі кантроль партыйных работнікаў, якія навязвалі свой рэпертуар.

Аднаўленне гаспадаркі патрабавала ад калектываў у першую чаргу ваенна-патрыятычных песень, песень пра партыю, У. Леніна, аб Радзіме і радаснай працы. Мноства песень было створана самадзейнымі кампазітарамі: Р. Галавасцікавым, П. Шыўко, І. Любанам, П. Шыдлоўскім. Народная песня ў выкананні аматарскіх калектываў таго часу нярэдка ўключалася ў новы кантэкст, атрымлівала зусім іншы змест, але не страчвала свайго яркага нацыянальнага складу. Гэтаму садзейнічала тэматыка твораў і шырокае выкарыстанне ў сувязі з гэтым нацыянальна-песеннага рэпертуару [2, с. 251].

Мы не можам не ўзгадаць калгасны ансамбль песні і танца Дзяржынскага гарсавета пры калгасе «Ленінскі шлях», народны хор в. Казловічы Слуцкага раёна, харавы калектыў калгаса «Полымя» Заслаўскага раёна.

У харавой аматарскай творчасці гэтага перыяду склаліся спрыяльныя ўмовы для праяўлення творчай ініцыятывы і таленту як кампазітараў, так і выканаўцаў. Пасля стварэння Дзяржаўнага народнага хору БССР вялікай папулярнасцю карысталіся яго салісткі М. Адамейка і Г. Аўдзеенка, якія атрымалі ганаровыя званні «заслужаная артыстка».

Але асноўнымі носьбітамі народнапесенных традыцый заставаліся і застаюцца фальклорна-этнаграфічныя калектывы. Найбольш вядомыя з іх гурты в. Букча і в. Тонеж Гомельскай вобласці. У рэпертуары гэтых калектываў традыцыйныя каляндарна-абрадавыя і пазаабрадавыя песні. Для выканальніцкага майстэрства названых гуртоў характэрная шырока разгорнутая палітра паўночна-беларускага поліфанічнага харавога шматгалосся.

Цікавую творчую працу прадстаўляе дзейнасць гуртоў в. Стаўбун і в. Янава Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці, в. Морач Мінскай вобласці і в. Старае Сяло Магілёўскай вобласці, в. Бабінічы Віцебскай вобласці. Асноўнае месца на шляху захавання традыцыйнага народнапесеннага выканальніцтва ў іх творчасці займае ўзнаўленне абрадавай і лірычнай пазаабрадавай спадчыны ў выкананні жанчын. Манера выканання мясцовых песень вылучаецца надзвычай прыгожым, даведзеным да дасканаласці выкананнем, злітнасцю голасавядзення і эмацыянальна-экспрэсіўнай падачай песеннага матэрыялу.

Патрабаванні часу, навукова-тэхнічны прагрэс, змена складу і ўмоў жыцця нанеслі свой адбітак на праяўленні фальклорных традыцый у творчасці аматарскіх калектываў. Аматарская творчасць сучаснага перыяду зведала пэўныя змяненні. Зніклі вялікія па колькаснаму складу хары, з'явіліся фальклорныя ансамблі, ансамблі песні і танца. Шырокае распаўсюджанне набыло дзіцячае фальклорнае мастацтва.

На сучасным этапе аўтэнтычны фальклор у яго сапраўдным выглядзе яшчэ дзе-нідзе захаваўся ў вясковай мясцовасці і выкарыстоўваецца фальклорна-этнаграфічнымі калектывамі. Характэрнай асаблівасцю такіх гуртоў з'яўляецца тое, што іх удзельнікі людзі сталага і старэйшага ўзросту. Беларускую народную песню тут спяваюць так, як спявалі заўсёды, перадаючы вусна з пакалення ў пакаленне.

Асваенне і захаванне аўтэнтычнага фальклору адбываецца ўдзельнікамі маладзёжных фальклорна-этнаграфічных гуртоў і іх кіраўнікамі пры дапамозе

праслухоўвання і расшыфровак запісаў сабранага песеннага матэрыялу ў фальклорных экспедыцыях, праз глыбокае вывучэнне і пераймание манеры выканання, стылістыкі, форм бытавання, эмацыянальнага пасылу голасу. Маладзёжныя гурты «Ветах», «Талака», «Верас», дзіцячы гурт «Госціца» ў сваёй творчасці не толькі ўзнаўляюць народнапесенныя традыцыі, але імкнуцца перадаць на сцэне каларыт і спецыфіку атмасферы народнай песні ў незвычайных, адарваных ад традыцыйных, умовах бытавання. Напрыклад, каб пазнаёміць і зацікавіць сучасную моладзь з аўтэнтычным мастацтвам, прапагандысты гэтага фальклорнага кірунку выкладчыкі кафедры этналогіі і фальклору УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» В. Калацэй  і Т. Пладунова разам са студэнтамі даволі паспяхова праводзілі дыскатэкі ў начным клубе, дзе разам з публікай танцавалі побытавыя танцы і спявалі беларускія народныя песні.

Шматлікую групу аматарскіх фальклорных калектываў складаюць ансамблі народнай песні і народныя хары, якія выконваюць апрацаваныя беларускія народныя песні і творы беларускіх кампазітараў. Сярод такіх калектываў народны ансамбль беларускай песні Мінскага палаца культуры і спорту чыгуначнікаў «Церніца», народны фальклорны ансамбль «Крупіцкія музыкі» Крупіцкага цэнтра культуры Мінскага раёна, народны фальклорны гурт «Жураўінка» Слабадскога сельскага дома культуры Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці, фальклорны ансамбль «Неруш» УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», фальклорны ансамбль «Рунь» УА «Беларускі тэхналагічны ўніверсітэт», «Горліца» УА «Беларускі эканамічны ўніверсітэт», «Ярыца» УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» і інш. Названыя калектывы маюць высокі мастацкі ўзровень выканання беларускай народнай песні, багаты разнастайны рэпертуар і з'яўляюцца актыўнымі прапагандыстамі народнапесеннага мастацтва. Правільна выбраная методыка работы з народным голасам, беражлівыя адносіны да песеннай спадчыны, выкарыстанне сапраўды дастойных узораў народнапесеннага матэрыялу ў рэпертуары гэтых калектываў, дазволілі дасягнуць амаль што прафесійных вынікаў ва ўзнаўленні народнай песні.

Кіраўнікі калектываў — дыпламаваныя спецыялісты ў вобласці народнапесеннага мастацтва, якія граматна працуюць над захаваннем народнапесенных традыцый. Метады навучання народнай манеры спеваў вядуцца пры дапамозе нотных партытур ці з голасу кіраўніка, які сам добра валодае выканальніцкім майстэрствам. Праца над гукавядзеннем, дыкцыяй, нюансамі, мастацкім вобразам – асноўныя шляхі засваення і ўдасканалення майстэрства спеваў.

Асобную групу сярод выканаўцаў беларускай народнай песні складаюць вучэбна-эксперыментальныя фальклорныя гурты і вучэбныя народныя хары, якія існуюць у музычных навучальных установах. Гэта ансамбль народнай песні і танца «Валачобнікі», фальклорны ансамбль «Грамніцы», ансамбль салістаў «Беларуская песня» УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», хор народнай песні Мінскага музычнага вучылішча імя М. І. Глінкі, фальклорны ансамбль «Лагода» Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў і інш.

Тут вядзецца практычная работа па вывучэнні народнапесенных традыцый, а таксама вывучаюцца методыкі навучання народнай манеры спеваў і працы з фальклорнымі калектывамі. Рэстаўрацыя фальклорнай песні праяўляецца ва ўменні кіраўніка навукова падыходзіць да асэнсавання песеннага матэрыялу. Кожны такі вучэбны калектыў мае свой мастацкі твар і працуе па сваёй методы-

цы навучання народна-песеннаму выканальніцтву. Гэта своеасаблівыя творчыя лабараторыі па засваенні і захаванні народна-песеннага мастацтва.

Кірункі вучэбнай дзейнасці прадугледжваюць авалоданне народнай манерай спеваў, асаблівасцямі выканання розных па жанры народных песень, музычна-выканальніцкай культурай розных рэгіёнаў Беларусі на прыкладзе лепшых узораў творчасці носьбітаў фальклорных песенных традыцый, авалоданне навыкамі і ўменнямі акцёрскага майстэрства раскрыцця вобраза песні, вывучэнне звычаяў і абрадаў.

Вельмі цікавы, на наш погляд, творчы напрамак выбраў фальклорны ансамбль «Грамніцы». Яго кіраўнік, прафесар кафедры народнапесннай творчасці У. Зяневіч на падставе апрацовак беларускай народнай песні розных рэгіёнаў Беларусі, захоўвачы рэгіянальнае традыцыйнае гукаўтварэнне, накладвае зусім сучаснае амаль джазава-эстраднае суправаджэнне. Выступленні калектыву карыстаюцца поспехам, студэнты з вялікім задавальненнем працуюць над расшыфроўкамі і аранжыроўкамі песеннага матэрыялу.

Вялікі практык і знаўца песеннага фальклору, заслужаны работнік культуры, прафесар С. Дробыш пастаянна шукае ўсё новыя і новыя падыходы да ўзнаўлення народнай песні на сцэне, умела спалучае танец і песню. Апрацоўкі народных песень М. Сіраты, якія выконвае ансамбль «Валачобнікі», дакладна перадаюць традацыю беларускай народнапесеннай спадчыны.

Свой творчы кірунак выбраў і ансамбль салістаў «Беларуская песня», на чале якого дацэнт І. Грамовіч. Шляхі вывучэння народнай песні і методыка навучання народнай манеры спеваў у калектыве вядзецца пры дапамозе працы з нотнай партытурай. Сцэнічнае майстэрства будучых выканаўцаў-салістаў народнай песні дасягаецца праз выпрацоўку сцэнічнага руху, жэстаў, мімікі. Суправаджэнне пад фанаграму -1 уносіць сучасную афарбоўку ў гучанне народнай песні.

Захаванне нацыянальных выканальніцкіх традыцый вельмі складаны і цяжкі працэс. Музыказнаўцы і этнографы рэспублікі выказваюць незадаволенне вынікамі развіцця народнапесеннай творчасці. Існуе шмат праблем, паўстае шмат пытанняў, звязаных з пераасэнсаваннем форм бытавання фальклорных традыцый у сучасных умовах. У рэспубліцы амаль што не запатрабаваны выканаўцы народнай песні, па пальцах можна пералічыць кампазітараў, якія пішуць творы для народных калектываў, рэпертуар многіх калектываў аднолькавы і, нарэшце, не хапае выкладчыкаў па навучанні народнай манеры выканання, хормайстраў фальклорных калектываў. На беларускім тэлебачанні няма ніводнай перадачы аб беларускім песенным фальклоры, аб творчасці аматарскіх і прафесійных фальклорных калектываў. Вельмі мала сведак аб фальклорных фестывалях і тых калектывах, якія прымаюць у іх удзел. Амаль што няма метадычных распрацовак па навучанні народнай манеры спеваў з захаваннем беларускай народнапесеннай традыцыі, недастаткова выдаецца рэпертуарных зборнікаў для фальклорных калектываў.

Мы ўпэўнены, што наша народнапесенная спадчына павінна застацца для нашчадкаў, таму што яна вельмі прыгожая і бясцэнная.

*Літаратура*

1. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд (2002). — Мінск : БелДІПК, 2003. — С. 91—104.
2. Гісторыя беларускай савецкай музыкі. — Мінск : Выш. шк., 1971. — 541 с.
3. *Смагін, А.* Харавое мастацтва Беларусі XX стагоддзя. Манаграфія / А. І. Смагін. — Мінск : Беларускі ўніверсітэт культуры, 1998. — 191 с.